**Карпекін, К.** Легенды Лёзненшчыны / К. Карпекін // Краязнаўчая газета. – 2008. – № 10 (сакавік). – С. 6.

**ЛЕГЕНДЫ ЛЁЗНЕНШЧЫНЫ**

***Народная памяць схільная захоўваць разнастайныя звесткі пра ўсемагчымыя нягоды і адметныя выпадкі. Адначасова яна скажае іх і даносіць да наступных пакаленняў у самым неверагодным выглядзе. У сваю чаргу мы, сучасныя людзі, імкнемся разгадаць такія пасланні з мінулага. Толькі што ў выніку: першапачатковая праўда ці яшчэ большая блытаніна?.. Ніхто ніколі не даведаецца.***

***Тое ж і з падзеямі руска-французскай вайны 1812 года на Лёзненшчыне, пра што тое-сёе можна пачуць ад мясцовых старажылаў – захавальнікаў гістарычнай народнай памяці. Легенды гэтыя вабяць сваёй таямнічасцю не толькі летуценнікаў-краязнаўцаў, але, як аказваецца, і аматараў лёгкай матэрыяльнай спажывы.***

***Я застаў дадзеныя легенды прыкладна ў наступным выглядзе (дарэчы, каб не зробленыя ў розныя часы занатоўкі, то і я што-небудзь бы абавязкова напартачыў са зместам легенд).***

Згодна з храналогіяй, пачнем з падзей руху французскіх войскаў углыб Расійскай імперыі. Як расказваў маёй бабулі яе бацька (а расказваў ён тое, што чуў ад сваіх продкаў), у той час на ўскраіне мястэчка Лёзна рос стары дуб – настолькі вялізны, што, бывала, падчас дажджу пад ім хаваліся некалькі падводаў разам з людзьмі і коннымі. Праязджаючы акурат каля гэтага дрэва, імператар Напалеон загадаў вырваць яго з зямлі і пасадзіць галлём уніз. Пры гэтым ён зазначыў: «Як дубу не прыжыць, так рускім мяне не перамагчы!» Але, натуральна, усё адбылося наадарот: і дуб зазелянеў, як ні ў чым не бывала, і французы вымушаныя былі ўцякаць з тутэйшых мясцін.

Наступны цыкл легенд і нібыта рэальных падзей звязаны з **французскімі курганамі і валатоўкамі** – «пахаваннямі іншаземных заваёўнікаў». Такія курганы як быццам знаходзіліся ў Завалоках – хмызняках ля вёскі Замошша. Адзін з мясцовых жыхароў, які ўсё жыццё пасвіў жывёлу (і пры гэтым карыстаўся ў аднавяскоўцаў рэпутацыяй шчырага чалавека), бачыў там дзіўную з’яву. Уночы на адным з курганоў з’явіўся кот, ад якога зыходзіла яркае ззянне. Казалі, што такія каты з’яўляюцца на месцах, дзе закапаныя скарбы. Не можа быць, каб ніхто не шукаў схаванага багацця, але ніхто і не паведаміў пра вынікі сваіх пошукаў.

Адзін з падобных курганоў быў пасярод Замошша, на адным з агародаў. Яго дасціпны гаспадар знайшоў прымяненне кургану: пабудаваў на ім лазню. У тыя часы наяўнасць лазні лічылася своеасаблівай раскошай: не ў кожнага ў двары яна была. Вышэй згаданы чалавек не быў сквапным, таму па суботах запрашаў да сябе аднавяскоўцаў. Толькі мыццё ў той лазні прыносіла мала задавальнення: час ад часу знізу нехта пачынаў грукаць і скрэбсціся ў палогу. Не трэба мець асаблівую фантазію, каб здагадацца, хто гэта быў. Так распавядала гэтую гісторыю мая бабуля.

Сваячка ж таго чалавека пазней узгадвала, што адразу пасля Вялікай Айчыннай вайны акурат у кургане вырашылі наладзіць зямлянку. Калі раскопвалі зямлю, каб зрабіць жыллё (а таксама спадзяваліся знайсці якія-небудзь залатыя зубы ці іншыя каштоўнасці), то натрапілі на чалавечыя косці. Асабліва жанчыне запомніўся чэрап з густымі чорнымі кучаравымі валасамі.

Таксама шмат валатовак было недзе пад Баравой, Чарнаруччам…

Гісторыкі сцярджаюць, што да такіх легенд трэба адносіцца досыць скептычна. Нібыта на самой справе пад насыпамі пахаваныя прадстаўнікі старажытнага насельніцтва, што жыло тут некалькі тысячагоддзяў таму. І «чорных археолагаў» чакаюць не незлічоныя багацці, а ў лепшым выпадку асобныя гліняныя пасудзіны.

У заключэнне – яшчэ адзін **сюжэт пра золата**, думкі пра якое так настойліва пранікаюць у чалавечую свядомасць. Некаторыя шукаюць і там, дзе можна, і там, дзе нельга.

Адначасова прасочым змяненне легенды, якое адбываецца літаральна на нашых вачах. Колькі гадоў таму ад дзяцей-школьнікаў можна было пачуць аповеды пра тое, што ў вёсцы Матушова ёсць нейкі **пагорак, насыпаны над мураваным склепам.** Уваход у яго знаходзіцца пад вадой (бо побач працякае рачулка). Менавіта ў гэты склеп схаваў нарабаваныя багацці Напалеон. А багацці гэтыя – не абы-якія: залатая карэта, напоўненая грашыма і ўпрыгажэннямі.

Крыху пазней я пачуў ад жыхара вёскі Куляціна (што па суседстве з Матушовам) іншую легенду пра тыя ж мясціны. Аказваецца, на ўзгорку калісьці стаяў палац нейкага князя. А скляпенне – не скляпенне, а падмурак палаца. І ніякі Напалеон са сваім войскам тут не праходзіў і свае багацці не хаваў. Але ў падзямеллі сапраўды знаходзіцца нешта цікавае – конь, выраблены з золата, і бочка віна. Хто дабярэцца да іх, той і мае поўнае права завалодаць пітвом і каштоўным металам. А яшчэ адна незвычайнасць узгорка – тое, што з-пад яго б'е крыніца, таму нават у самае засушлівае лета трава тут сакавітая і зялёная. Ёсць тут і нейкі падземны ход, што злучае скляпенне з сажалкай, выкапанай ля падэшвы ўзгорка.

Што гэта: два варыянты легенды ці, як часта бывае, не дачулі, не зразумелі, расказалі па-свойму, выдалі за праўду?

Як бы там ні было, але аповеды мелі рэальны працяг – пошукі ці то каня з віном, ці то карэты, ці то ўсяго разам. Некаторыя праглі дабрацца да запаветнага скарбу індывідуальнымі намаганнямі. Нават расказваюць, што аднаму вяскоўцу ўдалося прабіць столь скляпення звычайным ломам. Пры гэтым лом выслізнуў з рук і доўга ляцеў, пакуль не грукнуўся аб падлогу. Аналагічныя захады імкнуўся ажыццявіць і тагачасны старшыня калгаса. Ён захацеў асушыць рэчку, каб дабрацца да ўвахода ў склеп. Але мясцовыя жыхары не дазволілі яму гэтага зрабіць, бо на той час у рэчцы вадзілася багата рыбы. Тады пад кіраўніцтвам старшыні ў вёску прыгналі экскаватар і спрабавалі разбярэдзіць таямнічы ўзгорак. У выніку атрымалі два пагнутыя каўшы.

***Хутка і гэтыя падзеі абрастуць легендамі. Так было і так будзе працягвацца: матэрыяльная мінуўшчына знішчаецца людзьмі, тэхнікай, легенды – і тыя змяняюцца з вялікай хуткасцю. Усё змяняецца.***

Канстанцін Карпекін,
г. Віцебск